**Л.М. Грыцук** (Брэст, Беларусь)

# РЭАЛІЗАЦЫЯ «ВЕЧНЫХ» МАТЫВАЎ У ПАЭЗІІ А.С. ПУШКІНА І Я. КУПАЛЫ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ЖАНРА ЭЛЕГІІ)

А.С. Пушкін і Янка Купала жылі ў розны час, мелі розны сацыяльны статус, але сваімі творамі ў многім падобныя, бо звярталіся да «вечных» матываў – тых, якія хвалююць людзей ужо не адно тысячагоддзе і будуць хваляваць і далей. Асабліва выразна яны раскрываюцца ў элегіях.

Элегія як жанр зарадзілася ў Старажытнай Грэцыі і Старажытным Рыме. Гэта былі эрота-рамантычныя творы Каліна, Феагніда, Салона, Мімнерма, Праперцыя, Тыбула, Авідзія і іншых аўтараў. У сваю чаргу антычная элегія паходзіць з фальклорнай песеннай творчасці: яе вытокам былі «заплачкі». Але літаратурны варыянт падобных твораў не абавязкова быў сумны па змесце. З цягам часу ў розных краінах абнаўляліся тэмы і матывы элегій, з'яўляліся творы-медытацыі, у якіх паэты разважалі пра жыццё і смерць, скардзіліся на няшчаснае каханне, на зменлівасць лёсу і хуткацечнасць зямных уцех, зямной асалоды. Першапачатковы варыянт элегіі быў зацвярдзелай формы: напісаны элегічным дыстыхам. Пазней форма стала адвольнай, а змест набыў сентыментальны або трагедыйны пафас, таму твор і назвалі «сумным вершам».

Культ элегіі як жанра ў рускай літаратуры пачынаўся ў эпоху класіцызму, сярод лірычных жанраў якога яна выконвала пэўную ролю: у ёй перадаваліся пачуцці, перажыванні, звязаныя з унутраным светам чалавека, якога адольвае жаль, смутак, якому хочацца паскардзіцца на свой нялёгкі лёс. Так складвалася разнавіднасць сентыментальнай элегіі ў форме маналога-скаргі.

У перыяд сцверджання сентыменталізму, а затым рамантызму элегія набывае новы, больш шырокі, змест, пачынае актыўна развівацца ў розных змястоўных напрамках. Жанравая форма элегіі, звязаная з перадачай індывідуальных, унутраных перажыванняў асобы, аказалася бліжэйшай светаадчуванню сентыменталістаў, чым класіцыстаў. Элегія сентыменталістаў была элегіяй расчаравання. Гэтым матывам яна часцей за ўсё і абмяжоўвалася. Адно што ён мог толькі вар'іравацца. Пазітыўны змест выключаўся. Элегіі В.А. Жукоўскага, К.М. Бацюшкава, ранніх А.С. Пушкіна і Я.А. Баратынскага у адрозненне ад падобных твораў М.М. Карамзіна выяўлялі ў значнай ступені складанасць і шматпланавасць духоўнага жыцця чалавека.

Яскравым узорам падобнага тыпу вершаў могуць быць элегіі А.П. Сумарокава. Рамантыкі былі незадавольнены рэчаіснасцю, канфліктавалі з ёю, культывавалі павышана суб'ектыўны пачатак у паэзіі,

свабоду самавыяўлення асобы, дасягнулі такога стану ў творчасці, калі «суб’ект лірычнай медытацыі <...> валодаў вельмі высокім узроўнем грамадзянскай свядомасці», займеў «глыбокую маральную адказнасць» [4, 78] за ўсё на свеце – цяперашняе і мінулае.

З даўніх часоў і да нашых дзён элегія захоўвае такія ўстойлівыя рысы, як устаноўка на раскрыццё інтымных пачуццяў расчаравання ад нешчаслівага кахання, скарга на адзіноту, вострае адчуванне нявечнасці зямнога быцця. Мэта паэта-элегіка – найчасцей прывесці чытача ў такі душэўны стан, каб ён адчуў смутак лірычнага героя, прымусіць яго падумаць пра сутнасць існавання, знайсці суцяшэнне ва ўзаемаадносінах з вечнай прыродай, у гарманічным укладзе вясковага жыцця, у сяброўстве, у шчасці ўзаемнага кахання.

Смерць і бяссмерце, каханне і дружба, асоба і грамадства – гэтыя «вечныя» матывы закраналі ў сваёй лірыцы А.С. Пушкін і Янка Купала – сапраўдныя майстры элегійнага жанру.

**Матыў нешчаслівага кахання** ў А.С. Пушкіна цесна звязаны з **матывам самоты**. У любоўных элегіях «Развітанне», «Заклінанне», «Для берагоў далёкай айчыны» асноўная тэма – ростань з каханай, якую паэт абагаўляе, называе «гением чистой красоты», «мимолетным виденьем». Боская ідэальнасць вобраза каханай жанчыны падкрэсліваецца радкамі: «и я забыл твой голос нежный, твои небесные черты» («Да***»), «как легкий звук иль дуновенье, иль как ужасное виденье» («Заклінанне»). Лірычны герой у творах паэта, верны мінулым радасным і светлым успамінам пра поўнае згадак прыгожае і чыстае жыццё, не страчвае надзеі быць каханым: «пускай умру, но я умру любя!» («Жаданне»).

У Янкі Купалы каханая – рэальная, зямная жанчына, жняя, гарманічная асоба, якая ў час працы выглядае зямной царыцай: «Як сама царыца // Ў залатой кароне, // Йдзе яна ў вяночку // Паміж спелых гоняў» («Жняя»). Яна знаходзіцца ў гарманічным суладдзі з прыродай – ветрам, сонцам. У вершы-закліку «Пакахай мяне, дзяўчынка... » шчаслівае каханне паэт атаясамлівае з канкрэтнымі рэчамі: «Без вадзіцы б аніколі // Рыбкі не жылі; // Без кахання шчасця, долі // Няма на зямлі». Каханне само па сабе не выклікае ў лірычнага героя смутку, наадварот, яно з'яўляецца той сілай, якая можа каханую дзяўчыну пазбавіць ад «крыўды на людзей», ад «смутку і пацех».

З восені 1828 года ў лірыцы А.С. Пушкіна, самотнага паэта, страціўшага каханую (бацькі А. Аленінай не дазволілі паэту ажаніцца з іх дачкой), адным з дамінуючых матываў становіцца **матыў дарогі**. Ён тыпова рамантычны, азначае добраахвотныя ўцёкі герояў на ўлонне прыроды з «душных гарадоў», незадаволенасць адносінамі да іх грамадства. Гэты матыў звязаны таксама з матывам свабоды. Сумныя, а то

і змрочныя дарожныя ўражанні і думкі А.С. Пушкіна, як сцвярджае А.Г. Гукасава, прыводзяць паэта «не да сцвярджэння бессэнсоўнасці быцця (Баратынскі) і не да пасіўнага прыняцця жыцця, а да ўзмацнення актыўнага пачатку, да неабходасці ўсвядоміць сэнс быцця як адной асобы, так і грамадства» [ 2, 17]. Паэт шукае сэнс быцця, але смутак у час вандровак не пакідае яго. У вершы «Дарожныя скаргі» (1830) матыў дарогі быццам працягвае тэму **самоты**. На першы погляд, верш здаецца жартаўлівым, але Пушкін за лёгкасцю інтанацыі хавае глыбіню трагічных думак і пачуццяў: «Долго ль мне гулять на свете // То в коляске, то верхом, // То в кибитке, то в карете, // То в телеге, то пешком». Як бачым, перш за ўсё ў вершы чуецца нежаданне паэта быць пахаваным у чужым краю, «не средь отеческих могил» (дарэчы, такая ж думка гучыць у вершы Янкі Купалы «Прыстаў я жыць... »: паэт жадае «пад крыжам бацькавым сканаць»). У вершы «Калымага жыцця», напісаным Пушкіным у перыяд паўднёвай ссылкі, сцвярджаецца, што сасланы ў чужы край паэт не зможа змяніць кругазварот жыцця, памяняць ці задобрыць уладу, якая вымусіла яго жыць далёка ад родных мясцін, сяброў. Паэт страсна жадае вярнуцца дадому: «То ли дело рюмка рома, // Ночью сон, поутру чай; // То ли дело, братцы, дома!.. »

**Матыў самоты** гучыць у такіх вершах А.С. Пушкіна, як «Прарок», «Паэт», «Паэту», у якіх выразна вымалёўваецца вобраз самотнага, незразумелага «чэрню», «натоўпам» песняра. У перыяд да 1825 года і пасля яго вядучай тэмай у творчасці А.С. Пушкіна аказваецца тэма «паэт і цар». І гэта не выпадкова, бо вядома, што ён прагнуў унутранай свабоды і, на жаль, не мог пазбегнуць штодзённага кантролю, цэнзуры з боку ўлады. Ды яшчэ Мікалай І у 1833 годзе надаў Пушкіну званне камер-юнкера, якое яго назаўсёды заняволіла, далучыла да дварцовых інтрыг. Паэту застаецца толькі згадваць пра былую вольніцу, сумаваць, што часы яе адышлі.

Па-рознаму Янка Купала і А.С. Пушкін уяўляюць сябе ў ролі **паэта-прарока**. У вершы Я. Купалы «Паўстань...» прарок – «своеасаблівы варажбіт, які мудрым словам здолеў бы скінуць з народа «ўрок, якім быў век праз ворагаў спавіт» [5, 66]. Гэты прарок-пясняр, на думку Янкі Купалы, павінен паўстаць «з народу нашага», каб «адбудаваць свой збураны пасад». Верш «Прарок» прасякнуты трывогай з той прычыны, што прарок аказваецца не зразумелы людзьмі:

Сярод маны, сярод насмешкаў,
Знак нейкі тулячы к грудзям,
Ішоў прарок пясчанай сцежкай
З навукай новаю к людзям.

Прарок гэты «з рабства клікаў // Людзей на волю», «ждучы з трывогаю вялікай // Ад іх адказу неўнарок», але ўсё ж паўстае перад людзьмі-

«кратамі» лішняй асобай, у якой людзі пытаюцца: «Па колькі ж нам дасі чырвонцаў, // Калі мы пойдзем за табой?» Параўноўваючы верш «Прарок» (1912) з вершам «Паўстань...» (1919), можна зрабіць выснову, што пасля зменаў грамадска-палітычнага становішча ў дзяржаве Янка Купала надае прароку больш «паўнамоцтваў», лічыць яго «вадаром» народа.

Паэт, як лічыць класік рускай літаратуры А.С. Пушкін, сваёй дзейнасцю павінен прыносіць карысць чалавеку і чалавецтву, абуджаць чалавечую душу ад сну, апатыі. Даследчык творчасці Янкі Купалы Рыгор Бярозкін лічыць, што «і Пушкін, і Лермантаў падымаліся да прароцкага разумення той гістарычнай ролі, якую адыграе народ у будучым», і дадаваў: «Купала прыйшоў у літаратуру як выразнік інтарэсаў, спадзяванняў і мар беларускага сялянства» [1, 48–49]. М.Р. Ярош пісаў пра Янку Купалу амаль таксама: «Калі паэт глыбока ўсвядоміў, што яго прызванне – быць прарокам не толькі сацыяльнага, але і нацыянальнага вызвалення народа, ён з зайздроснай паслядоўнасцю пачаў выяўляць спрадвечныя крыўды і абуджаныя надзеі свайго роднага народа» [ 6, 141].

Элегія А.С. Пушкіна «Безумных лет угасшее веселье» з'яўляецца як бы прэлюдыяй да цыкла «болдзінскіх **успамінаў**». Зварот да **мінулага** не толькі сагрэты ў ёй успамінамі пра «печаль минувших дней», але і звязаны з трывожнымі думкамі аб цяперашнім і будучым – рыса, уласцівая ўсёй пушкінскай лірыцы. Мінулае патрэбна захаваць у сэрцах і душах для нашчадкаў, лічыць паэт. У «Элегіі» адчуваецца разнастайнасць, шырыня і глыбіня пастаўленых пытанняў, выразна паказваецца тыповасць з'яў тагачаснага жыцця. Верш «Успамін» дазваляе чытачу адчуць атмасферу ночы, якая для паэтаў-філосафаў з'яўляецца неабходнай умовай паглыбленага пазнання свету і самога сябе [3, 115]. Вершы, напісаныя ў Міхайлаўскім у 1824 годзе, прасякнутыя тугой, але затым яна пераадольваецца адчуваннем прыгажосці паўночнай прыроды, простага сялянскага побыту [3, 91]. Абудзіць успамін пра нядаўняе мінулае дапамагаюць паэту рамантычныя фарбы і рамантычныя пачуцці, метафары – «ропот заунывный», «смиренный парус», «говор волн».

Калі паэзія А.С. Пушкіна «адлюстравала» розныя перыяды яго жыцця, то «ў паэзіі Купалы не знайшлі свайго адлюстравання «фазы яго жыцця» у тым сэнсе, як гэта меў на ўвазе Герцэн, гаворачы пра Пушкіна» [1, 50]. Янка Купала менш аўтабіяграфічны, чым А.С. Пушкін у сваіх элегійных творах.

**Матыў успаміну** Янка Купала закранае ў вершах рознай тэматыкі. У вершы «З мінуўшых дзён» ён звяртаецца да гістарычнай тэматыкі, дае магчымасць чытачу паглыбіцца ў часы Старажытнай Русі: «Перайшло, мінула, // Што калісь жыло, // У курганах заснула, // Зеллем парасло». У вершы «Засталіся нівы, сёлы» выразна гучыць тэма вайны. А ў вершы «У

чужой старане» па за мяжой паэт успамінае прыгнечаных беларусаў: «Ах, салодкі ўспамін не адзін // шалясціць, як вяроўкаю кат... // Столькі іх, гэтых мілых часін! // А забыці іх сілы няхват».

Матыў **жыцця і смерці** таксама характэрны як рускаму, так і беларускаму паэту. У вершы А.С. Пушкіна «Ахоўвай, талісман, мяне» лірычны герой адчувае тугу па неажыццёўленых надзеях, карціна смутку вельмі ўдала ствараецца з дапамогай вобразаў-сімвалаў «акіян», «бура», «парус», «плавец»: «Свяшчэннай слодычы падман, душы чароўнае свяціла» (пераклад Яўгена Міклашэўскага. – *Л.Г.*). Разам з тым паэт адкідае суцэльны песімізм («Няхай у век сардэчных ран // Не цвеліць памяць хіжай зданню») і адчай («бывай, надзея; спі, жаданне»). Трывожнае чаканне непазбежнай буры («бурай грымне ў дні цяжкія») узмацняецца ў творы рэфрэнам «мяне ахоўвай, талісман», які надае вершу характар заклінання.

Лірычны герой Янкі Купалы таксама не страшыцца смерці, якая, на яго думку, навечна пазбавіць чалавека ад прыгнёту на роднай зямлі. І хоць «душа жадае небыцця», паэт спачатку звяртаецца да Бога, каб той дапамог яму «святлом зніштожыць нашы мукі», і пры гэтым «не згінуць з бацькаўшчыны мілай» («Прыстаў я жыць... »).

Пры ўсім змястоўным падабенстве творы А.С. Пушкіна і Янкі Купалы адрозніваюцца ў плане характару адлюстравання пачуццяў, перажыванняў, выкарыстання рэалій жыцця. Яны – прадстаўнікі розных мастацкіх метадаў. Янка Купала – лірык маналагічны, трагедыйны, рэаліст і блізкі да сімвалістаў, яго паэзія больш медытатыўная. Элегічныя творы А.С. Пушкіна больш рамантычныя і апісальныя. Я. Маймін сцвярджае, што «пушкінская элегія і ў сваёй галоўнай думцы, і ў адначасовым аўтарскім адкрыцці выклікае ўражанне ўзвышанай і не менш таго – мудрай» [3, 99].

Літаратура:

1. Бярозкін, Р. С. Свет Купалы. Думкі і назіранні / Р. С. Бярозкін. – Мінск : Беларусь, 1965.
2. Гукасова, А. Г. Болдинский период в творчестве А.С. Пушкина / А. Г. Гукасова ; под ред. Г. Н. Поспелова. – М. : Просвещение, 1973.
3. Маймин, Я. Пушкин: Жизнь и творчество / Я. Маймин. – М. : Наука, 1981.
4. Поспелов, Г. Н. Лирика: среди родов / Г. Н. Поспелов. – М. : Изд-во Моск. ун-та, 1976.
5. Рагойша, В. Янка Купала. Беларускай песні ўладар / В. Рагойша // Роднае слова. – 2001. – № 8.
6. Ярош, М. Р. Пясняр роднай зямлі / М. Р. Ярош. – Мінск : Бел.навука, 2003.